# ТЭХНАЛОГІІ НАЙВЫШЭЙШАГА ЎЗРОЎНЮ

## Прэзідэнт сустрэўся з кіраўніцтвам «Расатама»

**Ключавой тэмай размовы стала будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў нашай дзяржаве. Расійскія партнёры паабяцалі ўвесці станцыю ў эксплуатацыю праз тры гады — летам 2020-га.**

— Нам трэба сёння абмеркаваць надта важнае пытанне як з пункту гледжання эканамічнага, так і з палітычнага пункту гледжання, маральнага, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Вы ведаеце, што нам няпроста далося рашэнне аб будаўніцтве атамнай электрастанцыі пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Фобіі былі вельмі моцныя, але нам удалося іх пераадолець, запэўніць насельніцтва, што за гэтым будучыня. Гэта па-першае. Па-другое, гэта найвышэйшыя тэхналогіі: нароўні з касмічнымі, ІТ-тэхналогіямі, лічбавай эканомікай, «разумнымі тэхналогіямі» — за імі будучыня — я стаўлю і будаўніцтва атамнай станцыі.

Яе ўзвядзенню наша краіна ўдзяляе вельмі сур'ёзную ўвагу:

— Дастаткова сказаць, што я дэтальна азнаёмлены з планамі будаўніцтва атамнай станцыі і з ходам гэтага будаўніцтва. Больш за тое, нядаўна быў назначаны памочнік Прэзідэнта, які адказвае за здзяйсненне нацыянальных праектаў. Гэта ўзровень нацыянальнага праекта нароўні з іншымі, якія мы здзяйсняем, — іх каля дзясятка. Гэта вельмі затратныя праекты, таму мы ўдзяляем гэтаму сур'ёзную ўвагу.

Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што падчас сустрэч з Прэзідэнтам Расіі яны рэгулярна звяртаюцца да тэмы будаўніцтва атамнай станцыі.

— Уважліва кантралюем не толькі ход будаўніцтва гэтай станцыі, але і цэнавыя параметры, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Прэзідэнта Расіі вельмі цікавіць гэтае пытанне.

Аляксей Ліхачоў, генеральны дырэктар Дзяржаўнай карпарацыі па атамнай энергіі «Расатам» прыгадаў канец мая 2012 года, калі і стартаваў адпаведны праект. Тады Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу пабудаваць самую бяспечную і самую сучасную станцыю ў Еўропе. Кіраўнік «Расатама» запэўніў беларускага лідара, што кампанія дзейнічае, зыходзячы з яго пажадання. Сапраўды, гэта новае пакаленне па бяспецы — «3+». Па словах Аляксея Ліхачова, у свеце такіх аналагаў няма.

Учора дэлегацыя кампаніі наведала пляцоўку будаўніцтва Беларускай АЭС. Як паведаміў гендырэктар «Расатама», усю станцыю ў строй плануецца ўвесці летам 2020 года.

«Расатам» — расійскі дзяржаўны холдынг, які аб'ядноўвае больш за 360 прадпрыемстваў атамнай галіны. У склад карпарацыі ўваходзяць усе грамадзянскія атамныя кампаніі Расіі, прадпрыемствы ядзернага збройнага комплексу, навукова-даследчыя арганізацыі і атамны ледакольны флот. Кампанія займае другое месца ў свеце па запасах урану і чацвёртае па аб'ёме яго здабычы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Класныя навіны

# Матэматыку зноў будуць здаваць усе выпускнікі

**Пералік выпускных экзаменаў за курс базавай і сярэдняй школы ў наступным годзе не зменіцца. Міністэрства адукацыі зацвердзіла пералік прадметаў, якія будуць здаваць выпускнікі ў 2017/2018 навучальным годзе. Як і раней, дзевяцікласнікаў чакае дыктоўка па беларускай і рускай мовах, а веданне матэматыкі ў іх праверацьз дапамогай кантрольнай работы.**

Адзінаццацікласнікаў чакаюць два пісьмовыя экзамены (па матэматыцы, беларускай ці рускай мове на выбар) і два вусныя (па замежнай мове і гісторыі Беларусі). Такім чынам, матэматыку будуць здаваць усе — і «фізікі», і «лірыкі»... Але ўжо ў гэтым годзе адбыўся першы масавы выпуск з профільных класаў. А на старшай профільнай ступені вывучаюцца на павышаным узроўні і фізіка, і хімія, і біялогія, і іншыя дысцыпліны. Таму ўзнікае заканамернае пытанне: чаму выпускнікі не здаюць іспыты па сваім профілі? Па прадметах, якія яны вывучалі на павышаным узроўні два апошнія гады?

Напрыканцы навучальнага года начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Святлана Уклейка прызналася на сустрэчы з журналістамі, што пакуль незразумела, што рабіць з колькасцю экзаменаў, улічваючы даволі сціслыя тэрміны выпускной экзаменацыйнай кампаніі, якой на пяткі наступае ЦТ. «Да таго ж паміж выпускнымі іспытамі абавязкова павінен быць прадугледжаны дзень для адпачынку, таму павялічыць іх колькасць праблематычна», — растлумачыла яна і праінфармавала, што пытанне з пераглядам пераліку прадметаў на выпускных экзаменах будзе абмяркоўвацца ў чэрвені—ліпені на ўзроўні кіраўнікоў і спецыялістаў аддзелаў і ўпраўленняў адукацыі, а таксама падчас выездаў ва ўстановы адукацыі, каб знайсці разумны баланс.

Да таго ж усе з нецярплівасцю чакалі вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання, каб прааналізаваць, як справіліся з тэстамі па «сваіх прадметах» выпускнікі профільных класаў. Пакуль што гэта інфармацыя на агучвалася, але рашэнне пакінуць усё на наступны год без змен, ужо прынятае. Дарэчы, апасенні, што большасць дзесяцікласнікаў будуць выбіраць на старшай ступені школы гуманітарны профіль, не спраўдзіліся. Пакуль што сярод прадметаў, якія вывучаюцца старшакласнікамі на павышаным узроўні, лідзіруюць фізіка і матэматыка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У выніку выбуху ў Кабуле загінула больш чым 30 чалавек



Яшчэ больш за сорак чалавек атрымала раненні. Усе загінулыя — мірныя жыхары. Выбух прагрымеў непадалёк ад дома намесніка кіраўніка выканаўчай улады Хаджы Махамада Махакіка. У паветра ўзляцеў начынены выбухоўкай аўтамабіль. Падрыў здзейсніў тэрарыст-смяротнік. Паведамляецца, што мэтай нападу быў мікрааўтобус, які перавозіў супрацоўнікаў міністэрства гарнарудная прамысловасці і нафты. Адказнасць за тэракт узялі на сябе баевікі радыкальнага руху «Талібан».

### Тэмпы зніжэння сусветных запасаў нафты могуць паскорыцца

Тэмпы рэбалансіроўкі рынка нафты могуць паскорыцца ў другой палове 2017 года, сказаў журналістам у кулуарах пасяджэння міністэрскага камітэта «АПЕК+» генеральны сакратар картэля Мухамед Баркіндa. «Мы думаем, што тэмпы рэбалансіроўкі рынку, магчыма, замарудзяцца адносна нашых чаканняў, але аднаўленне працягваецца. Магчыма, тэмпы зніжэння сусветных запасаў нафты паскорацца ў другім паўгоддзі», — сказаў ён. Баркінда адзначыў, што краіны — экспарцёры нафты чакаюць вяртання на рынак сыравіны Лівіі і Нігерыі. Па ацэнцы Міжнароднага энергетычнага агенцтва, у сукупнасці гэтыя краіны нарасцілі здабычу на 450 тыс. бараляў нафты ў суткі адносна кастрычніка мінулага года.

### Рэйтынг даверу Макрону ў Францыі за месяц зваліўся на 10%



Рэйтынг даверу прэзідэнту Францыі Эмануэлю Макрону і прэм'ер-міністру рэспублікі Эдуару Філіпу рэзка скараціўся ўпершыню з моманту іх прыходу да ўлады ў маі. Пра гэта сведчаць даныя штомесячнага апытання Французскага інстытута грамадскай думкі, апублікаваныя газетай Le Journal du Dimanche. Паводле гэтага даследавання, Макрону напрыканцы ліпеня давярае крыху больш за палову французаў — 54%. Гэта на 10 працэнтных пунктаў менш, чым у мінулым месяцы. Доля незадаволеных работай новага прэзідэнта за месяц павялічылася з 35% да 43%. Станоўчую ацэнку дзейнасці кіраўніка ўрада даюць 56% апытаных, тады як месяц таму яго падтрымлівалі 64% рэспандэнтаў. Колькасць тых, хто негатыўна ацэньвае дзейнасць Філіпа вырасла за месяц з 35% да 43%.

### Фінскія навукоўцы прапануюць вырошчваць ежу з вугляроду і вадароду

Яны сцвярджаюць, што прадукт мог бы выратаваць ад голаду бедныя краіны і да таго ж палепшыць экалогію. Метад распрацавалі ў Тэхнічным універсітэце Лапенранта і Даследчым тэхналагічным цэнтры VTT. Для стварэння ежы — карычневай кашкі, смакавыя ўласцівасці якой не ўдакладняюцца, — выкарыстоўваюцца аднаклетачныя арганізмы. Ім для росту патрэбны толькі вуглярод і вадарод. Цяпер гатовага прадукту атрымліваюць толькі адзін грам у два тыдні, але даследчыкі вераць, што праз 10 гадоў можна будзе запусціць камерцыйную вытворчасць.

■ Знешняя палітыка

# Партнёрства праз чвэрць стагоддзя

**Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ наведаў з афіцыйным візітам Славенію. У Любляне ён сустрэўся з прэзідэнтам Славеніі Борутам Пахарам, міністрам замежных спраў Карлам Эр'яўцам, мэрам сталіцы Зоранам Янковічам і буйнымі бізнесменамі. Візіт прымеркаваны да 25-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Славеніяй.**

На сустрэчы з прэзідэнтам Славеніі Борутам Пахарам бакі разгледзелі шэраг пытанняў беларуска-славенскага ўзаемадзеяння і падкрэслілі неабходнасць павышэння ўзроўню палітычнага дыялогу. Асаблівая ўвага была ўдзелена адносінам Беларусі і Еўрапейскага саюза. Акрамя гэтага, закранулі пытанні міжнароднай бяспекі і абмеркавалі сітуацыю ў рэгіёне.

Падчас дыялогу кіраўніка беларускага знешнепалітычнага ведамства з яго славенскім калегам Карлам Эр'яўцам гаворка ішла пра будучыню двухбаковых адносін, у тым ліку, зноў жа, па лініі Беларусь — Еўрасаюз. Акрамя таго, адной з тэм стала ўзаемадзеянне ў рамках міжнародных арганізацый і супрацоўніцтва падчас беларускага старшынства ў Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятыве.

Важным пунктам перамоў стала актывізацыя гандлёвых і інвестыцыйных сувязяў. Сярод прыярытэтных кірункаў можна адзначыць інавацыйную і тэлекамунікацыйную сферы, будаўніцтва, энергетыку, сельскую гаспадарку, машынабудаванне і фармацэўтыку. На сустрэчы таксама разглядаліся пытанні прамкааперацыі, банкаўскага і міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Турызм

# Узяліся за новы брэнд

Пачалася работа па ўнясенні Аўгустоўскага канала ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА

**За прэзентацыю новага брэнда актыўна ўзяліся абодва бакі — беларусы і палякі. Што зроблена ў гэтым кірунку і якія найбліжэйшыя планы — аб гэтым ішла гаворка на пасяджэнні сумеснай рабочай групы ў Гродне.**

Аўгустоўскі канал набывае папулярнасць у турыстаў. Для гэтага зроблены важныя захады. Па-першае, пачаў дзейнічаць бязвізавы ўезд, па-другое, на рачным пункце пропуску з 28 красавіка мяжу можна перасячы не толькі па вадзе, але і пешшу альбо на веласіпедзе. Такой магчымасцю ўжо скарысталіся амаль 1,5 тыс. чалавек. Ёсць намер адкрыць яшчэ адзін пункт пропуску ў зоне канала. Таксама разглядаецца пытанне задзейнічання ў бязвізавай зоне чыгуначнага транспарту і авіяпералётаў.

— Турысты едуць, а гэта значыць, што мы павінны стварыць ім умовы, — адзначыў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ.** — Таму мы будзем выходзіць з ініцыятывай, каб падоўжыць бязвізавы ўезд, а таксама і тэрмін знаходжання турыстаў — да 10 сутак.

Па словах **віцэ-маршалка Падляскага ваяводства Багдана ДЫЮКА,** польскі бок будзе садзейнічаць таму, каб турысты, якія прыбываюць у горад Аўгустоў, накіроўваліся на беларускую частку канала. Для гэтага трэба стварыць тут прывабныя ўмовы, развіваць інфраструктуру, наладзіць выпуск сумеснай рэкламнай прадукцыі — картаў, даведнікаў, інфармацыі па рабоце бязвізавага рэжыму.

Удзельнікі рабочай групы вырашылі, што сумесная работа будзе весціся па тэхнічнай эксплуатацыі шлюзаў. Гэта важны момант, бо ад яго залежыць судаходнасць канала. А некалькі кіламетраў прыгранічнай акваторыі засталіся без увагі. Настаў час прывесці ў належны стан памежны шлюз, заняцца паглыбленнем канала, каб па ім маглі хадзіць не толькі байдаркі, але і парусныя судны.

Плануецца задзейнічаць беларускую частку канала ў папулярным у свеце пеша-веласіпедным маршруце GREEN VELO. Для гэтага спатрэбіцца працягнуць яго на 10 км ад польскай вёскі Мікашуўкі да пункта пропуску на канале. Затым маршрут пройдзе ўздоўж Нёмана, вывядзе веласіпедыстаў у літоўскі Друскінінкай. Такім чынам, Аўгустоўскі канал упішацца ў вядомы трансгранічны маршрут і стане турыстычнай маркай трох краін — Польшы, Беларусі і Літвы.

— Мы зможам паказаць еўрапейскім турыстам, што канал — гэта не толькі невялікі ўчастак паміж шлюзамі, — зазначыў Багдан Дыюк. — Ён можа выкарыстоўвацца ад Бебжы да Нёмана.

Гродзенцы расказалі аб тым, што створана літаральна нядаўна. Так, у населеных пунктах каля канала пачаў дзейнічаць музей пісанкі, ручнікa, музеефікаваны фарты часоў Першай сусветнай вайны. На канале з'явілася рэзідэнцыя Дзеда Мароза, праводзіцца каля дзясятка фестываляў, марафонаў, канцэртаў. З'яўляюцца аграсядзібы, месцы адпачынку, веладарожкі.

— Мы спадзяёмся, што канал будзе ўключаны ў Спіс ЮНЕСКА, гэта дасць новы імпульс нашай сумеснай рабоце, — падкрэсліў Віктар Лісковіч. — Мы ўжо распрацавалі стратэгію развіцця канала, а таксама лагатып і брэнд.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

**Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні саветніку-кансультанту сектара кадраў і спецработы Сакратарыята Савета Рэспублікі Габралёвай Алене Леанідаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БРАТА.**